


Ігар МАРЗАЛЮК

# Ведаўскія працэсы ў Беларусі XVI—XVII стагоддзяў

Ведаўскія працэсы ў Вялікім княстве Літоўскім, як і ва ўсёй Еўропе, былі цесна звязаны з працэсамі канфесіяналізацыі. Праследаванне абвінавачаных у ведаўстве ў ВКЛ, паводле актавых крыніц, пачалося не пазней за другую палову XVI ст.[1]. Аднак аналіз такой крыніцы, як "Песня пра зубра" (1522) Міколы Гусоўскага, дазваляе аднесці пачатак працэсу абвінавачвання і пакарання вядзьмарак і чарадзееў у ВКЛ да пачатку гэтага ж стагоддзя:

*Як не згадаеш сабе пра цуды сучаснага веку,*
*Хрысталюбіўцы аднак хочуць усё заказаць.*
*Схопяць і ўраз валакуць на касцёр чалавека любога,*
*Як пагалоска аб ім дойдзе да іхных вушэй.*
*Кара насцігне й таго, хто аднойчы ў штуках вядзьмарства*
*Трохі замешаны быў, ды аб хаўрусе маўчаў.*
*Вось неяк плёткі людзей кагось незнарок зачапілі,*
*Самыя ж факты віны трэба яшчэ высвятляць:*
*Схопяць адразу яго, павяжуць і рукі, і ногі,*
*Дзе паглыбей, у ваду кідаюць, быццам чурбак.*
*Бачаць, што цягне на дно, то, значыцца, невінаваты;*
*Плавае, лічаць, што ён звязан з нячысцікам нейк.*
*Я назіраў, як спавіты дзярг'ём з вірамі змагаўся,*
*Каб найхутчэй галаву цалкам накрыла вадой.*
*З лямантам просты народ глядзеў на судзілішча гэта,*
*Жах няўцямны й мяне цалкам здранцвелым рабіў.*
*Голаў заклятую плынь чамусьці глынаць не жадала,*
*Быццам ужо на сябе мала падобна рака.*
*Болей сумленны агонь, калі судзіць вядзьмацкія справы:*
*Дзе зашугае, дык там зло вынішчае да тла.*
*Можа, не верыце мне? Тады самі ў Літве пабывайце,*
*Зведаўшы наша быццё, сцвердзіце словы мае,*
*Блуду вядзьмарства аднак часцей аддаюцца жанчыны,*
*Хіба з хірлявых якіх стрэнеш мужчын-ведзьмакоў*[2].

Тэкст з паэмы "Песня пра зубра" вельмі важны ў тым сэнсе, што тут упершыню ў айчыннай гісторыі адлюстраваны ўяўленні пра чарадзейства як пра ведаўства; для яго вызначэння выкарыстоўваюцца кампаненты, характэрныя для "класічнай" заходнееўрапейскай дактрыны ведаўства, у тым ліку прыўнесеныя тэолагамі, — сувязь ведзьмаў і чарадзееў з нячыстай сілай, пакланенне д'яблу[3]. Прыведзеныя формы пакарання за вядзьмарства таксама нельга аднесці да спрадвечнай традыцыі мясцовага насельніцтва. Выпрабаванне вадой, як і спаленне на вогнішчы, былі характэрны якраз найперш для ведаўскіх працэсаў у Заходняй Еўропе.

У ВКЛ, як і ў астатняй Еўропе, першы ўдар прыйшоўся па знахарах, якія лячылі сродкамі народнай медыцыны, зашэптамі і замовамі. Пік ведаўскіх працэсаў у ВКЛ прыпадае на XVII ст. Тэалагічная ведаўская дактрына распаўсюдзілася ў гэты час надзвычай шырока. Паводле яе, ведзьмы лятаюць на шабаш з д'яблам, уступаюць з чарцямі ў палавыя сувязі для набыцця чарадзейнай сілы[4].

*МАРЗАЛЮК Ігар Аляксандравіч — загадчык секцыі археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.Куляшова. Нарадзіўся ў 1968 г. У 1992 г. скончыў МагДПІ імя А.Куляшова. У 1996 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Аўтар больш за 80 навуковых прац па археалогіі і гісторыі Беларусі, манаграфіі "Магілёў у XII—XVIII стст. Людзі і рэчы" (Мн., 1998), калектыўнай манаграфіі (у сааўтарстве з А.Р.Агеевым і І.А.Пушкіным) "Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах" (Выд. 1-е. Магілёў, 1997; выд. 2-е. Магілёў, 1999). Падрыхтаваў і выдаў рукапіс Еўдакіма Раманава, прысвечаны складанню археалагічнай карты Магілёўскай губерні "Невядомая спадчына Еўдакіма Раманава" (Магілёў, 2001).*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Ведзьма пры дапамозе чорта зачароўвае рыцара і селяніна. 1537 г.*



*Выгнанне чарцей.*
Старажытны малюнак, на якім паказваецца, як свяшчэннік праганяе чарцей з апанаванага імі манаха.

Такія ўяўленні даволі хутка распаўсюдзіліся ў свядомасці мас. Яны былі характэрныя і для праваслаўных, і для католікаў. Пра гэта красамоўна сведчаць і актавыя крыніцы, і кананічнае права праваслаўнай царквы, у якім чарадзейства і яго формы ўжо ў пачатку XVII ст. знайшлі належнае вызначэнне. Чарадзей заслугоўвае толькі смерці. “Бог повеле бо таковые смертию казнити, звещая сице: волхв да не живет”[5]. “Чародей, сиреч, волхов и прорицатель, восколей, и оловолей, или превязуя животнея, да неснесть ея волк, ... или чародействуяй в буру”[6]. “Чаровници сіи суть: иже негли Давидскиа псалмы поюще, мученческая имена, и самые Пресвятые Богородица вспоминающе, и с ими, еже от бесов слагают чарованиа”[7]. Як бачым, у апошнім выпадку адбываецца прамое атаясамленне чараўніцы са знахаркай, якая лечыць людзей малітвай з ужываннем імёнаў Багародзіцы і святых пакутнікаў. Такая дзейнасць адназначна трактавалася як інспіраваная чарцямі.

У сувязі з гэтым паказальнай з’яўляецца трагедыя, што пачалася ў Слоніме, а скончылася ў Наваградку. У 1630 г. абвінавачаная ў чарадзействе і асуджаная на спаленне як чараўніца Паўлюкова Кароткая акрамя таго што “выкрыла” дзвюх чараўніц у Слоніме, дык яшчэ абвінаваціла ў чарадзействе пападдзю Раіну Мянкоўскую-Грамыку. Прычым віна апошняй, згодна з паказаннямі Кароткай, была ў зачароўванні “его милости пана маршалка найвышшого великого князства Литовского” Яна Сапегі, каб не даць яму ажаніцца: “Але скоро бы попадыю узяли, теды бы где хотел бы и королевну понял бы; ... але если попадыю озмете, все добро его милости будеть, бо тая попадья половицою света трясеть”[8]. Раіна Мянкоўская-Грамыка была схоплена і прывезена ў Наваградак. Як вынікае з лістоў Я.Сапегі да суддзяў, ён шчыра верыў у віну “чараўніцы” і пастаянна атрымліваў звесткі пра следства над ёй. Матэрыялы судовай справы сведчаць, што няшчасная пападдзя была павітухай і знахаркай, і яе запрашалі прымаць роды прадстаўнікі заможных шляхецкіх сем’яў; яна таксама лячыла дзяцей з дапамогай народнай медыцыны і магіі. Падсудную ж абвінавачвалі ў навядзенні на людзей сурокаў, сувязях з д’яблам, лятанні па паветры, адбіранні малака ў кароў. Крыж-машчавік, які знялі з яе, прынялі за рэч, неабходную для чаравання “праз косці святых”. Раіна Грамыка ўпарта адмаўляла

ўсе абвінавачванні, казала, што ніколі не рабіла людзям шкоды, не ведае ніякіх чараў. “Еже теж и о том поведила: же ничого больш не вмею, только дети малые покурыть, а тесницу одходыть, и лекарство на тое: вылеванье олова, зелье деветерник и руту ярую у молодом пиве уварыти и до верху головы прыкладати научала, и вылечыти его милость пана маршалка од тескницы обецовала”. Раіна Грамыка была прызнана вінаватай і спалена[9].

Вельмі часта ў чарадзействе абвінавачвалі блудніц. Згодна сярэдневяковым хрысціянскім уяўленням, блудніца з’яўляецца памагатай і інструментам у руках д’ябла. Кананічнае права уніяцкай царквы яшчэ ў 1722 г. сярод сексуальных злачынстваў называе “бестиалство, сполкование с бестиею” і “сполкование с Диаволом, беручим на себе тело человеческое, что чинят чаровници”[10]. І таму даволі часта блудніцы станавіліся ахвярамі намоў і абвінавачванняў у чарадзействе з боку родзічаў іх кліентаў. Так, у 1588 г. заляцанні двух хлопцаў да Марыі Юдзінай іх родныя ўспрынялі як вынік чараў. “Иван Иевлевич мещанин могилевский а Иван Ходотович, Давид Тарасович, Тимох Тишкович жаловали на мещанку могилевскую Марю Юдинну. Напрод Иван Иевлевич жаловал иж дей брата моего чарами очаровала иж бавечыся приней рок о ту жадное речи не может яко од часу не малого так шло ... ночи прошлое ею у нее в дому з суседми есми его поимал ... есмо ходил з ним и з иншими суседми и там же у дому ее знаишли брата его. ... А Давид Тарасович жаловал на тую ж Марю Юдинну иж дей сын мой Михалко не ведати для которое причины ходит у день и в ночи которого тым же способом очаровала чарами своими”[11].

Такім самым чынам берасцейскай зямянкай Ганнай Цывінскай у 1628 г. была абвінавачана віленская пані Раіна Цыцкавая: “Жаловала и оповедала земянка господарская повету Берестеиского еи милость пани Ганна Яблоновская — Петровая Цывинская, на тот час хорою и в дорозе будучая, через пана Яна Свирского, вуя своего, на белую голову лезную, тут в месте Виленском перемешькиваючую, на име Раину Янушъковскую, бывшую Шарадавскую, теперешнюю Миколаевую Цыцковую о том, штож деи помененая Цыцковая, яко перед тым, ним пошла замуж, недаром се бавила, так и по поистью за теперешнего мужа своего Миколая Цыцку нерадом се бавечы, розных людей до себе прывабляла.

Межы иншыми и малжонка еи милости пани Цывинскои его милости пана Петра Цывинского, в року теперешнем 1628 недавно до Вилна прыехалого, снат через якиес чары и зводницы прылудивши, первеи через колко ночь у себе в каменицы его милости пана Юря Коленды, у Вилни в тыле костела светого Казимера лежачои, а потом и за другим прыездом в сем же року 1628, месеца марца розными часы и днями в тои же каменицы з его милостю обцовала и всяким способом малженскии стан розлучыт хотечы, на самую еи милость паню Цывинскую розными часы и днями и на розных местцах отповед и похвалку на здорове еи милости учынила и чынит не переставает, обецуючы еи милости з мужом разлучыт и самую через чары, албо иншым способом з сего света згладит, или смерт прыправит”[12].

Актавыя матэрыялы з магістрацкіх кніг Магілёва другой паловы XVI—XVII ст. дазваляюць скласці ўяўленне пра ведаўскія працэсы ў горадзе, якія былі даволі нешматлікія. Вера ў чарадзейства ў гэты час застаецца сталым элементам менталітэту магілёўскіх месцічаў. Адно з першых паведамленняў пра чарадзейства ў Магілёве датуецца 1577 г., калі ўдава “Васіа Скомороховаіа” скардзілася на ўдаву Марыну Гаўрылаўну, з якой яна сумесна жыла і якая нібыта імкнулася чарамі звесці яе са свету, “... вчинивши пофалку на здорове иаких колве чаров сукман серый и теж и наметку ножом в нодей з сего света спрана шатанскими ей збавит поклоти мела”[13].

Пакаранне за чарадзейства звычайна было толькі адно — смерць. Чарадзея, як і блюзнерасвятататніка, які абрабаваў царкву, спальвалі на вогнішчы. Такія “выракі” выносіліся і гродскімі, і магістрацкімі, і копнымі судамі[14]. Матэрыялы пра чарадзейства, якія разглядаліся на копных судах у XVII ст., дазваляюць сцвярджаць, што кара смерцю на вогнішчы чакала чарадзея альбо чараўніцу ў выпадку, калі суд лічыў устаноўленым факт смерці, хваробы альбо нанясення матэрыяльнай шкоды пацярпелым (выкліканне эпізаотый, заломы ў жыце, “адбіранне” малака ў кароў). Пры гэтым матэрыялы копных судоў сведчаць, што для сялянства ў XVII ст. сувязь чарадзея з д’яблам, з нячыстай сілай уяўлялася несумненнай. Прыкладам могуць служыць выпадкі разбору даху ў доме для таго, каб душа чарадзея пасля яго смерці магла выйсці з цела і г. д. Магічныя ж дзеянні, якія не прывялі да страты здароўя ці смерці, капа не лічыла чарадзействам[15].

Асобна варта сказаць і пра любоўную магію. Прывядзём выпадак, які адбыўся ў 1790 г. у Кобрыне. Мяшчанка Апалонія Паўлавічова была абвінавачана ў тым, што параіла дзяўчыне Мар’яне Герычовай памыцца настоем розных галінак, а потым іх закапаць ноччу на праваслаўны Вялікдзень каля дома, дзе жыў малады

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хлопец. Гэта павінна было паспрыяць таму, каб ён закахаўся ў дзяўчыну. Суд прыгаварыў Апалонію Паўлавічову да 50 удараў на рынкавым пляцы, а таксама праляжаць "крыжам" усю абедню ў Прачысценскай царкве[16]. Гэта было вельмі лёгкае пакаранне.

Абвінавачванні ў чарадзействе былі распаўсюджаны і ў Полацку ў першай палове XVII ст. Полацкі месціч Васіль Паук у 1638 г. скардзіўся, што "в ночы, нет ведома, хто надышовшы на знак чаров, ворота и стены пана Василья Пауковича у Полоцку на венцы стоячого з улицы не ведати чым позаливал ... хтось за тым заливаньем на здоровье самого пана Василья Пауковича, пани малжонки и детей их пугаеть»[17]. У 1640 г. Ян Лісоўскі абвінаваціў Крыштафа Старымовіча — мешчаніна і бурмістровіча полацкага — у навядзенні на яго чараў пры дапамозе тараканаў, ад якіх "дохне быдла і пагаршаецца здароўе". У тым жа годзе палачанін Пётр Марціновіч скардзіўся ў магістраце, што яму падкінулі ў кадку з вадой вялікі пук жаночых валасоў з мэтай яго зачараваць[18].

Вядомае нам па архіўных дакументах пакаранне ў Полацку адбылося ў першай палове XVII ст., калі полацкі мешчанін Васіль Брыкун, абвінавачаны ў чарадзействе, быў спалены на вогнішчы. Суседзі абвінавацілі яго ў чарадзействе, у выніку чаго яны збяднелі, страцілі маёмасць, адбыўся сямейны разлад і атруцілася жывёла. Стрыечная сястра памерлай жонкі Васіля Брыкуна, Ананя Шванава, абвінаваціла яго ў тым, што ён звёў сваю жонку на той свет пры дапамозе чараў, а сама Ананя цяжка захварэла. Але што цікава! Апавядаючы пра хваробу сястры, яна для доказу віны чараўніка Брыкуна спасылаецца на аўтарытэт "валхвіта Івана", які жыў за некалькі міль ад Полацка і да якога яна вазіла на лячэнне сваю сястру[19]. Аднак ні для суддзяў, ні для гэтай жанчыны "валхвіт", які лячыў людзей, памагатым д'ябла не быў. У той жа час учынкі Брыкуна суддзі ацанілі менавіта як служэнне нячыстай сіле, таму ён быў спалены на вогнішчы.

Адно толькі абвінавачанне ў чарадзействе ў Полацку ў 1650 г. прывяло да імгненнага затрымання абвінавачанага. Полацкі мешчанін Васка Губар разам з сынам Івашкам скардзіўся "на мещан того ж места Полоцкого Якова Пчолку и на сестру его Симоновую о то, иж кгды он, Пчолка, захорал теды они невинне его, Губара, помовляют и до враду удают, якобы оного Пчолку очаровати мел, за которою тою помовкою в турме през цалую ноч седел"[20].

Аднак не кожнае абвінавачванне магістрат лічыў абгрунтаваным. Крыніцы сведчаць і пра факты пакарання даносчыкаў, якія не здолелі даказаць свае абвінавачванні. Напрыклад, у 1637 г. магілёўскі мешчанін Харка Кузміч абвінаваціў у чарадзействе сваю суседку Арыну Турцавую, якая даглядала яго маёмасць і дзяцей. Абвінавачванні былі разнастайныя: ад чарадзейства да звычайнага крадзяжу. Аднак пакліканыя на суд суседзі не пацвердзілі гэтых абвінавачванняў супраць Арыны Турцавай і здолелі давесці, што яна і яе бацька "добрых людей быти" і нічога злога не "чынили". Пазіцыя сведак абумовіла яе апраўданне магілёўскім магістратам. Харка Кузміч і яго жонка за паклёп "... абое в куне за шыю през три дни, почавши от годины девятае, аж до десятое с поранку, стояти повинны будут"[21].

Апраўданнем закончылася справа пра чарадзейства ў Полацку, калі ў 1663 г. магістрацкі суд палічыў недаказанымі абвінавачванні "пастушкі-чараўніцы" Кулакоўскай у тым, што яна чарадзействам зводзіла людзей са свету і "адбірала" малако ў кароў[22].

Зусім іншы лёс напаткаў у Магілёве Янку Казлова і яго каханку Ульяну. Акрамя таго, што імі была ўкрадзена частка маёмасці жонкі Янкі, Ульяна, па яго ўласнаму прызнанню, перад гэтым гаварыла: "... я тваёй жонкай, а ты маім мужам будзеш ... Потым падавалі адзін аднаму рукі, і ў знак гэтага Ульяна, сеўшы на маім лоне, сказала, каб вырваў у сябе з галавы валасы, (потым. — **І.М.**) забрала сабе і, вырваўшы свае, перадала мне". Ульяна таксама прасіла Янку, каб ён узяў след сваёй жонкі і зямлі з-пад ганка, але той не пагадзіўся гэта рабіць. Абодва былі пакараны смерцю. Янку павесілі, а Ульяну, прызнаўшы чарадзейкай, утапілі ў Дняпры[23].

У 1669 г. інстыгатар каптуровага суда Базыль Зуб абвінаваціў магілёўскі магістрат за "... неналежное, мимо позволенье нашое, справ криминалных, часу теперешъного ... в месте Могилевским через позваных приватым сужене и, под претекстом таковых судов, мещанкі Могилевское ... неведат от кого и о якоес чародейство обвиненое, на смертъ спалит огнем всказане, и того декрету своего до екзекуцыи неслушне приведени"[24].

Палалі вогнішчы і ў Быхаве. Магілёўскі храніст Трафім Сурта так апавядае пра падобныя здарэнні: "У гэтым жа 1688 годзе. У месяцы маі і чэрвені спалена ў Быхаве каля дзесяці чараўнікоў, а іншыя паўцяклі на Украіну, імёнаў іх дзеля нашчадкаў я не называю"[25].

Аўтар вядомага дыярыушу наваградскі падсудак Фёдар Еўлашэўскі апавядаў пра свае сустрэчы з нячыстай сілай: "... едучи з Вильня до дому, мяновите в Дорогове, в стодоле ночуюти, обачилэм юж на свитаню в ызбе огнистого чловека, до кторекгто кгдым се порвал,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

он тэж до мне выстэмповал и, зшедшисе срод избы, порвалэм з запаля ноже и ударилэм нань. А он, зникнувши зась, се был в тым же конте указал и зновон до мне шедл. А я чапкон рутилэм нань и окно отворилэм, юж малый день был. А то згинуло.

... Затым невяста, стара шляхтянка, неяка жолнэрова, кгдым ей мовил о тым видзэню, же се боем, если бым кгде не заповетрил (бовем и в Новокгродку было поветре), она мне рече: "Не бойсе, не поветре!". Але, указавши недалеко свой домэк, "З окна, — поведила, — виделам, яко лятавец приходи до тэй ту невясты кгосподарской"[26].

На жаль, характар актавых крыніц і амаль што поўная адсутнасць "чорных" гродскіх кніг не дазваляюць скласці падрабязную статыстыку ведаўскіх працэсаў па гадах. Аднак тыя факты, што зафіксаваны ў дакументах, даюць падставы зрабіць выснову, што ведаўскія працэсы адбываліся ў Рэчы Паспалітай практычна на працягу ўсяго XVII ст. Крымінальная адказнасць за чараўніцтва была адменена ў Рэчы Паспалітай толькі сеймавай канстытуцыяй 1776 г.[27].

Дадзеныя этнаграфіі сведчаць, што ў масавых уяўленнях беларускага сялянства, звязаных з чарадзействам, у XIX — пачатку XX ст. былі глыбока ўкаранёны элементы менавіта "тэалагічнай" ведаўскай дактрыны, якія нельга трактаваць як проста рудыменты дахрысціянскай язычніцкай архаікі. Гэта найперш датычыць уяўленняў пра сувязі чараўніц і чарадзеяў з д'яблам, трактоўкі чараўніц як каханак чарцей, ад якіх яны здольны нараджаць дзяцей і атрымліваць магчымасць лятаць па паветры, пераканнняў пра дамовы чараўніц і чарадзеяў з д'яблам[28]. Гэтыя факты дазваляюць сцвярджаць, што такія ўяўленні склаліся не раней XVI—XVII стст. і былі звязаны з працэсамі канфесіяналізацыі.

---

1 Raganu teismai Lietuvoje. Parenge K.Jablonscis ir R.Jasas. Vilnius, 1987. S. 423.

2 Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мн., 1994. С. 20.

3 Рассел Дж.Б. Колдовство и ведьмы в средние века. СПб., 2001. С. 41.

4 Raganu teismai Lietuvoje. Parenge K.Jablonscis ir R.Jasas. S. 423.

5 Минея праздничная. Трифологион. Кутейно, 1647. Арк. 17.

6 Номаканон. Киев, 1624. Арк. 29.

7 Там жа. Арк. 30.

8 Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. III. Вильна, 1867. С. 114, 116.

9 Там жа. С. 106, 109, 110, 117, 140, 142, 165.

10 Собрание припадков краткое, и духовным особам потребное. Супрасль, 1722. С. 113.

11 НГАБ. Ф. 1817, воп. 1, спр. 3; Актавая кніга Магілёўскага магістрата. 1588. Арк. 208 адв.

12 Raganu teismai Lietuvoje. Parenge K.Jablonscis ir R.Jasas. S. 163.

13 Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. XXXII. Витебск, 1906. С. 203.

14 Спрогис И. Древний копный суд в Северо-Западной Руси. Витебск, 1895. С. 16.

15 Акты Виленской археографической комиссии. Т. XVIII. Вильна, 1891. С. 513, 514, 263—265.

16 Там жа. Т. XVI. Вильня, 1888. С. 511.

17 Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. I. Вильна, 1867. С. 307.

18 Там жа. С. 323, 324.

19 Там жа. С. 341—344, 345.

20 НГАБ. Ф. 1823, воп. 2, спр. 1. Актавая кніга Полацкага магістрата. 1650 г. Арк. 148 адв.

21 Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. XXXII. С. 297—301.

22 Акты Виленской археографической комиссии. Т. X. Вильна, 1879. С. 282—285.

23 Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. XVI. Витебск, 1885. С. 259.

24 Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской. Вып. XXVI. Витебск, 1895. С. 329.

25 Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. С. 302.

26 Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. С. 34.

27 Raganu teismai Lietuvoje. Parenge K.Jablonscis ir R.Jasas. S. 423; Марзалюк І. Магія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн., 1999. С. 32.

28 Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1895. С. 133—134, 139—145; Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Белоруссия и Литва. Т. IX. СПб., 1905. С. 168—170.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова